МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ
КУЛЬТУРЫ І МАСТАЦТВАЎ

# БЕЛАРУСКІ ТЭКСТЫЛЬ
# (РАЗДЗЕЛ БАТЫК)

Вучэбная праграма
для вышэйшых навучальных устаноў па спецыяльнасцях
1-15 02 01 Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва (па напрамках)
1-15 02 01-07 – дэкаратыўна-прыкладное мастацтва
(рэстаўрацыя твораў)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мінск 2012

Праграму распрацавала выкладчык кафедры народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Дамнянкова Л.У.

Рэцэнзенты:

Лазука Б.А. кандыдыт мастацтвазнаўства, дацэнт, загадчык адзела старажытнабеларускай культуры ІМЭФ НАН Беларусі.

Гулак А.А. кандыдат філалагічных навук, старшы выкладчык кафедры этналогіі і фальклору БДУКМ.

Зацверджана

Кафедрай народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва установы адукацыі "Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў" (пратакол № 10 ад 12.05.2012 г.).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Мастацкі тэкстыль важная частка беларускай нацыянальнай культуры, са сваімі старажытнымі каранямі і доўгім шляхам развіцця, асаблівасцямі развіцця, ўзаемадзеяння і ўспрыняцця здабыткаў сусветнага мастацтва.У сучаснай беларускай мастацкай практыцы шырокае распаўсюджанне атрымаў роспіс тканіны – батык. У ім закладзены невычэрпныя магчымасці, батык дазваляе ўвасобіць розныя ідэі, знайсці незвычайныя спосабы іх рэалізацыі.

Батычныя работы выкарыстоўваюць для арганізацыі прастранства розных памяшканняў, ужываюць ў дызайне касцюма і інтэр’ера.

Вывучэнне курса з’яўляецца важнай часткай прафесійнай падрыхтоўкі студэнтаў па спецыяльнасці “рэстаўрацыя і кансервацыя твораў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва”.

Асноўны змест курса накіраваны на авалоданне тэхнікай і тэхналогіяй апрацоўкі матэрыялаў, вывучэнне традыцыйных форм і відаў ДПМ, методык рэстаўрацыі, а таксама ўзбагачэнне іх новымі мастацка-вобразнымі, кампазіцыйнымі, тэхналагічнымі прыёмамі.

Курс прадугледжвае:

- вывучэнне вытокаў і традыцый народнага мастацтва Беларусі
- засваенне тэхнік і тэхналогій апрацоўкі матэрыялаў
- засваенне тэхналогій рэстаўрацыі і кансервацыі
- выкананне эскізаў мастацка-вобразнага, пластычнага і кампазіцыйнага вырашэння
- выкананне вучэбнай працы ў матэрыяле
- самастойную працу студэнтаў.

*Асноўнай мэтамі* курса з’яўляецца развіццё мастацкіх здольнасцяў студэнтаў, фарміраванне асобы мастака і яго нацыянальнай свядомасці праз далучэнне да традыцый народнага мастацтва.

*Задачы курса:*

- раскрыццё асаблівасцей традыцыйнай культуры Беларусі праз аналіз гісторыі рамяства;
- развіццё мастацка-вобразнага мыслення;
- авалоданне выразнымі сродкамі дэкаратыўнай кампазіцыі
- засваенне тэхік і тэхналогій рэстаўрацыі і кансервацыі твораў ДПМ;
- фарміраванне практычных навыкаў і ўменняў, неабходных для стварэння і рэстаўрацыі мастацкіх твораў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Вывучэнне батыка арганічна звязана з шэрагам сумежных дысцыплін: малюнкам, жывапісам, кампазіцыяй, гісторыяй мастацтва і гісторыяй дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, этналогіяй, што дае магчымасць успрымаць батык ва ўзаемасувязі з разнастайнымі з'явамі культурнага і мастацкага працэсу, сфарміраваць трывалыя веды.

Для больш глыбокага засваення матэрыялу мэтазгодна выкарыстоўваць такія формы арганізацыі вучэбнага працэсу, як наведванне музеяў адпаведнага профілю, выставак твораў выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, падрыхтоўку рэфератаў.

Праграма прадугледжвае набыццё ведаў і навыкаў работы ў розных тэхніках: свабодны роспіс, вузялковае афарбоўванне тканін, халодны і гарачы батык і інш. Лабараторныя заняткі ўключаюць інфармацыйную частку, дзе разглядаюцца мастацтвазнаўчыя, кампазіцыйныя і тэхналагічныя аспекты. Прыёмы работы ў матэрыяле выпрацоўваюцца ў ходзе выканання практыкаванняў і дэкаратыўных кампазіцый па ўласным эскізным распрацоўкам. Вывучэнне кожнага раздела завяршаецца праглядам вучэбных заданняў, творчых кампазіцый.

У выніку вывучэння курса студэнт павінен *ведаць*:

- асаблівасці розных відаў ДПМ;
- уласцівасці і пластычныя магчымасці матэрыялаў;
- магчымасці дэкору;
- абумоўленасць формы матэрыялам;
- спецыфіку кампазіцыйнага вырашэння твораў ДПМ;
- функцыі колеру ў творах ДПМ.

*умець*:

- выкарыстоўваць асноўныя законы ДПМ пры стварэнні твораў;
- праяўляць вобразнае мысленне;
- ствараць завершаную танальную, колеравую ці лінейна-пластычную кампазіцыю;
- выкарыстоўваць дэкаратыўную стылізацыю формаў;
- улічваць пры распрацоўцы твораў дэкаратыўныя якасці, уласцівасці і тэхналагічныя асаблівасці матэрыялаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН.

| Раздзелы і тэмы | Колькасць гадзін | | | |
|---|---|---|---|---|
| | усяго | лекцый | дробнагруп. | сам. раб. |
| **1. Развіццё мастацтва роспісу тканін** | | | | |
| 1.1. Уводзіны. Батык. Час і месца ўзнікнення, асноўныя спосабы роспісу, асаблівасці выкарыстання. | | 2 | | |
| 1.2. Спосабы ўпрыгожвання тканін, матывы і арнамент, стылістычныя асаблівасці дэкору. | | 4 | | |
| 1.3. Сучасны стан, мастацкія школы і напрамкі развіцця батыка. | | 2 | | |
| **2. Тэхнікі і тэхналогіі батыка** | | | | |
| 2.1. **Свабодны роспіс** | | | 4 | |
| Тэхналогія свабоднага роспісу, ужыванне загушчальнікаў. Прыёмы роспісу. | | | | |
| **2.2. Вузялковае афарбоўванне.** | | | 4 | |
| Характэрныя рысы дэкору ў тэхніцы вузялковага афарбоўвання тканіны. Абсталяванне, матэрыялы і інструменты. Спосабы атрымання малюнка на тканіне. | | | | |
| **2.3. Халодны батык.** | | | 8 | |
| Мастацкія і тэхналагічныя асаблівасці халоднага батыка. Абсталяванне, матэрыялы і інструменты. Резервуючыя саставы. Прыёмы работы рэзервам і роспісу фарбавальнікамі. | | | | |
| **2.4. Гарачы батык.** | | | 10 | |
| Абсталяванне, матэрыялы і інструменты. Резервуючыя саставы. Асноўныя | | | | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| спосабы работы і роспісу фарбавальнікамі. | | | | |
| Усяго: | 32 | 6 | 26 | |

**Змест праграмы**

**1. Развіццё мастацтва роспісу тканін**

**1.1.Уводзіны**

Мэты і задачы вучэбнай дысцыпліны. Асноўныя паняцці. Прадмет вывучэння.

***Батык.*** “Маляванне гарачым воскам” – старажытны спосаб аздаблення тканіны. Паўднёва-Усходняя Азія – месца ўзнікнення і развіцця батыка.

Батык – агульная назва разнастайных спосабаў ручнога роспісу тканін, аснову якіх складае прынцып рэзервавання з дапамогай спецыяльных саставаў. Значны арэал распаўсюджвання тэхнік атрымання ўзораў с дапамогай рэзерву: старажытны Кітай і Японія, Шрыланка і Індакітай, афрыканскія і паўднёва-амерыканскія краіны. Выкарыстанне аналагічных прынцыпаў дэкарыравання ў беларускай набіванцы і пісанкарстве.

**1.2. Спосабы ўпрыгожвання тканін, матывы і арнамент, стылістычныя асаблівасці дэкору.**

Асаблівасці аздаблення традыцыйных батычных тканін: рапортная арнаментацыя, свабоднае вар’іраванне ўмоўна-сімвалічных выяў, шырокае ўжыванне міфалагічных сюжэтаў, сімволіка колеру.

Асноўныя сучасныя спосабы роспісу: гарачы ці “класічны” батык, халодны батык, свабодны роспіс, вузялковае афарбоўванне.

***1.3. Сучасны стан, мастацкія школы і напрамкі развіцця.***

XIX ст.– час з’яўлення батыка ў Еўропе, асаблівасці існавання. М.Гартынская, Л.Маякоўская, Я.Данцова, Н.Юдзіна – першыя майстры мастацкага роспісу тканін ў пачатку XX ст.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сучасны стан, мастацкія школы і напрамкі развіцця. Беларускі батык, мастакі. Прамысловыя вырабы: хусткі, шалікі, купоны для сукенак і блузак.

## 2. Тэхнікі і тэхналогіі батыка

### *2.1.Свабодны роспіс*

Нескладанасць тэхналогіі, магчымасці ўжывання прыёмаў, вядомых ў акварэльнай тэхніцы: мазкі, заліўка, расцяжка, “сухі пэндзаль”, а-ля прыма і лесіроўка, солевыя эфекты і набрызг і г.д.

Шырокія магчымасці свабоднага роспісу для выканання пейзажных, нацюрмортных, эмацыянальна-асацыятыўных кампазіцый.

Асаблівасці расцякання фарбавальнікаў па тканіне. Тканіны для свабоднага роспісу. Залежнасць ступені расцякання ад якасці тканіны, выкарыстання загушчальніка і яго канцэнтрацыі.

Загушчальнікі − асноўны сродак памяншэння расцякання фарбавальнікаў па тканіне, атрымання большай колеравай насычанасці і выразнасці мазка.

Віды загушчальнікаў: солевыя, крухмальныя, крухмальна-дэкстрынавыя, жэлацінавыя і іншыя. Падрыхтоўка загушчальнікаў у залежнасці ад характару роспісу (выразныя мазкі, “сухі пэндзаль”, а-ля прыма і інш.). Спосаб ўжывання: нанясенне загушчальніка на тканіну ці ўвядзенне яго ў фарбавальнік.

Прыёмы роспісу. Роспіс без ужывання загушчальніка, работа а-ля прыма, выкарыстанне крышталёў солі і мачавіны для атрымання незвычайных эфектаў на тканіне.

Шматслойны спосаб роспісу пры выкарыстанні загушчальніка ў якасці грунту. Атрыманне мяккіх контураў малюнка на тканіне, аналогіі з акварэльнай тэхнікай “па сырому”. Значнае памяншэнне расцякання на кожным новым слоі. Магчымасць тонкай графічнай прапрацоўкі на апошнім слоі роспісу.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Спосаб работы прыёмам сухога мазка пры ўвядзенні загушчальніка ў раствор фарбы.

*Практыкаванне.* Авалоданне прыёмамі свабоднага роспісу, параўнанне атрыманых эфектаў і аналіз тэхнічных і мастацкіх магчымацей.

Выкананне свабоднага роспісу па баваўнянай тканіне з ужываннем крышталёў солі і мачавіны для атрымання незвычайных эфектаў.

***2.2. Вузялковае афарбоўванне.***

Вытокі тэхнікі вузялковага афарбоўвання ў мастацтве аздаблення шаўковых тканін Персіі і Сярэдняй Азіі. Мяккае, расплыўчатае ўліванне малюнка ў фон тканіны – характэрныя рысы дэкору вузялковага афарбоўвання. Бандан, плангі, шыбары, асаблівасці атрымання малюнка.

Адметная тэхнічная прастата ўпрыгожвання тканін у тэхніцы вузялковага афарбоўвання, шырокая сфера ўжывання: утылітарныя рэчы і складаныя асацыятыўна-вобразныя дэкаратыўныя кампазіцыі.

Абсталяванне: ёмістасці для падрыхтоўкі фарбавальнікаў і афарбоўвання, награвальныя прыборы (электраплліты). Шырокі дыяпазон тканін: ільняныя, баваўняныя, шаўковыя, шарсцяныя; белыя і гладкафарбаваныя, фактурныя, іх падрыхтоўка.

Анаілінавыя фарбавальнікі, рэцэптура, строгая адпаведнасць валакністаму саставу тканіны. Афарбоўванне: аб’ём раствора, тэмпература, час знаходжання тканіны ў растворы. Аднакаляровыя ўзоры. Варыянты паліхромнага афарбоўвання: з выкананнем першапачатковага свабоднага роспісу ад плямы або паэтапнае афарбоўванне ў некалькіх фарбавальніках ад светлых да больш цёмных колераў.

Вашчэнне рабочых нітак. Патрабаванні да дадатковых прылад і матэрыялаў (тэмаўстойлівасць і неафарбоўваемасць).

Спосабы атрымання малюнка на тканіне. Тугое перацягванне тканіны − аснова атрымання малюнка. Скамечванне, складыванне і скручванне − найбольш простыя прыёмы падрыхтоўкі тканіны да афарбоўвання і атрымання ўзораў; дадатковыя прылады: дошчачкі,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

скрэпкі, каменчыкі і інш. Прашыванне − прыём для атрымання на тканіне геаметрычных і стылізаваных прыродных форм. Ручныя швы, паслядоўнасць прашывання малюнка і сцягвання матэрыялу; шырыня ліній абмоткі.

*Практыкаванеі.* атрыманне на тканіне малюнкаў геаметрычнага характару спосабамі складвання: клетка, веер, кола, ромб і г.д.; афарбоўванне ў адзін колер.

### *2.3. Халодны батык*

Мастацкія і тэхналагічныя асаблівасці халоднага батыка.

Халодны батык − найбольш пашыраны і адносна просты спосаб дэкарыравання тканін. Наяўнасць замкнёнай контурнай лініі, выразная графічнасць – своеасаблівыя рысы малюнка ў халодным батыку. Маляўнічыя магчымасці тэхнікі: неабмежаванасць колькасці колераў і прыёмаў роспісу, тонкая прапрацоўка дэталей, магчымасці шматслойнага роспісу, спалучэнне з некаторымі прыёмамі і эфектамі іншых тэхнік.

Абсталяванне, матэрыялы і інструменты. Резервуючыя саставы.

Віды падрамнікаў для роспісу: раз'ёмныя і стацыянарныя; матэрыялы і тканіны для роспісу, іх падрыхтоўка. Інструменты, правілы выкарыстання і захоўвання. Фарбавальнікі, іх віды. Спосабы павелічэння расцякаемасці фарбавальнікаў па тканіне.

Рэзервіруючыя саставы, іх прызначэнне. Колеравыя і бясколеравыя рэзервы, іх ужыванне. Рэцэптура, правілы прыгатавання і захоўвання. Залежнасць канцэнтрацыі рэзерву ад таўшчыні і валакністага складу тканін.

Прыёмы работы рэзервам і роспісу фарбавальнікамі. Абводка малюнка за адзін прыём ці ў некалькі этапаў (скрыты рэзерў). Адзіная таўшчныня контуру, адсутнасць кропель і патаўшчэнняў, прамочванне тканіны рэзервам наскрозь, вытрымка часу высушвання – паказчык тэхнічнай якасці выканання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Асаблівасці роспісу абмежаваных рэзервам плоскасцяў: раўнамерная заліўка фарбавальнікам да лініі рэзерву, вызначэнне колькасці фарбавальніка на пэдзалі ў адпаведнасці з плоскацю пакрыцця для прадухілення перацякання праз контур, выкарыстоўванне першапачатковага ўвільгатнення паверхні.

*Практыкаванне.* Распрацоўка эскіза нескладанага матыву, нанясенне рэзерву, роспіс фарбавальнікамі ў адзін прыём. Выкананне роспісу гэтага ж матыву з выкарыстоўваннем скрытага рэзерву.

### *2.4. Гарачы батык*

Абсталяванне, матэрыялы і інструменты. Прылады для разагрэву рэзерву: электраштыфты, спецыяльныя ёмістасці з электрападагрэвам. Чанцінгі, лейкі, пэндзалі і іншыя прыстасванні для нанясення рэзерву, іх падрыхтоўка да работы.

Рэзервы, іх склад, падрыхтоўка да работы.

Традыцыйныя і сучасныя тканіны для роспісу, іх падрыхтоўка да работы.

Разнастайнасць і шырокія магчымасці спосабаў работы ў гарачым батыку. Просты батык – роспіс ў адно перакрыццё, яго варыянты: па неафарбаванаму і першапачаткова распісанаму заліўкай фону. Складаны батык, этапы выканання. Роспіс ад колеравай плямы – найбольш складаны і творчы спосаб дэкарыравання тканіны.

Асаблівасці ўжывання колеру і спецыфіка роспісу фарбавальнікамі. Поўнае высушванне колеравага слою на кожным этапе перад нанясеннем рэзерва – неабходная ўмова паспяховай работы.

Арганізацыя рабочага месца. Правілы бяспекі.

*Практыкаванне.*Выкананне наскладанай кампазіцыі ў некалькі перакрыццяў, падбор колькасці фарбавальнікаў, выкананне пробнай схемы колеравых слаёў у паслядоўнасці ад светлага тону да больш цёмнага.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## *Літаратура*

### *Асноўная*

1. Аллахвердова, Е.Э. Батик. Глина. Дерево. Домашнее рукоделие. / Е.Э. Аллахвердова – М.: АСТ», 2004.

2. Гильман, Р.А. Художественная роспись тканей: учеб. пособие для студентов вузов, обучающихся по специальности “Декоративно-прикладное искусство и народные промыслы” / Р.А.Гильман. – М.: ВЛАДОС, 2005.

3. Давыдова, Ю. С. Роспись по шелку. Платки, панно, палантины в технике «Батик»/ Ю. С. Давыдова − Ростов н/ Д: Феникс, 2005.

4. Давыдов, С.Г. Батик: Техника. Приемы. Изделия./ С.Г. Давыдов – М.: АСТ-ПРЕСС КНИГА, 2005.

5. Дворкина, И. А. Батик. Горячий. Холодный. Узелковый./ И. А. Дворкина – М.: Радуга, 2002, 2-е изд. — 2008.

6. Дамнянкова, Л.У. Мастацкі роспіс тканін: дапаможнік для студэнтаў маст.-граф. фак./ Л.У. Дамнянкова – Віцебск, 1994.

7. Даценко, Л.М. Роспись тканей и набойка / Л.М. Доценко – Л., 1961.

8. Козлов, В.Н. Основы художественного оформления текстильных изделий/ В.Н. Козлов – М.: Легкая и пищевая промышленность, 1981

9. Основы художественного ремесла. Вышивка. Кружево. Худож. ткачество. Ручное ковроделие. Худож. роспись тканей: практ. руководство для руководителей школьных кружков. / под. Ред. В.А. Барадулина и О.В. Танкус – М.: Просвещение, 1978.

10. Синеглазова, М.О. Распишем ткань сами / М.О.Синеглазова. – М.: Профиздат, 2001.

11. Стоку, Сузи. Батик. Практическое руководство./ Пер. с англ./ Сузи Стоку– М.: Издательский дом «Ниола 21-й век», 2005 г.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

12. Успенская, Е. Искусство батика./ Е. Успенская– М.: АСТ «Астель», 2004.

13. Терешина, Г.В. Батик своими руками/ Г.В. Терешина– М.: АСТ – ПРЕСС КНИГА, 2000.

14. Шлюбскі, А. Крашаніна (Набіванка)./А. Шлюбскі – Віцебск, 1926.

***Дадатковая***

1. Барвенава, Г.А. Тэкстыль Сярэднявечча на землях Беларусі / Г.А. Барвенава. - Мінск: Бел. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2008. - 246с.: іл.

2. Беларускія маляваныя дываны / Альбом-каталог з фондаў гісторыка-культурнага музея-запаведніка "Заслаўе". - Мінск, 2005.

3. Высоцкая, Н.Ф. Декоративно-прикладное искусство Белоруссии XII-XVIII веков / Н.Ф. Высоцкая. - Минск: Беларусь, 1984.

4. Экспериментальный текстиль: Каталог / Сост. Л.Д. Финкельштэйн. - Минск: Беларусь, 1990. - 24с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ